Алелькавічаў, з 1612 Радзівілаў, з 1695 прынцэсы Лізаветы Аўгусты Сафіі Нойбургскай, з 1744 зноў Радзівілаў, з 1832 Вітгенштэйнаў, з 1846 дзярж. ўласнасць. У 1791—93 у *Случарэцкім павеце* Навагрудскага ваяв. У 1886 у Бабруйскім пав., 676 ж., 61 двор, нар. школа, царква, у 1897 — 1368 ж., у 1906 адкрыта царк.-прыходская школа. З 20.8.1924 цэнтр сельсавета Старадарожскага р-на. У Вял. Айч. вайну 6.8.1941 ням. фашысты расстралялі 49 вяскоўцаў-мужчын, у т.л. 2 дзяцей. На 1.1.2002 у Я. базавая школа, дашкольная ўстанова, цэнтр культуры і адпачынку, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан часоў Вял. Айч. вайны. Брацкая магіла чырвонаармейцаў, што загінулі ў 1920, магілы ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры: царква сярэдзіны 19 ст. Каля вёскі курганны могільнік дрыгавічоў.

*Літ.*. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Старадарожскага р-на. Мн., 1998.

*Анатоль Валахановіч.*

**ЯЗЫЧНІЦТВА** (ад царк.-слав. «языцы» — народы, чужаземцы), п а г а н с т в а (ад лац. paganus язычнік), агульны тэрмін для абазначэння стараж. вераванняў і культаў, што існавалі да ўзнікнення і пашырэння «вышэйшых» монатэістычных рэлігій (будызм, хрысціянства, іслам). Я. лічыцца багаслоўскім тэрмінам, які традыцыйна выкарыстоўваецца ў адносінах да ідалапаклонства. У навук. працах слова «Я.» ўжываецца рэдка, часцей замяняецца тэрмінам «політэізм» (шматбожжа). Я. існавала многія тысячагоддзі і ў наш час яшчэ захоўваецца ў некат. народаў. Для Я. характэрны: вера ў шматлікіх багоў і божостваў (політэізм); абагаўленне розных прыродных сіл і стыхій (пантэізм); перакананне ў рэальным існаванні душы, добрых і злых духаў (анімізм); надзяленне чалавечымі рысамі і якасцямі прыродных з'яў, багоў, міфічных істот (антрапамарфізм); вера ў цудадзейную сілу асобных матэрыяльных прадметаў (фетышызм); уяўленні пра роднасць паміж людзьмі і пэўным відам жывёл, раслін (татэмізм); магічныя дзеянні; культ продкаў. Язычнікі прыносілі разнастайныя ахвяры (часцей прадукты харчавання, расліны, радзей — жывёл і нават людзей) шматлікім божаствам, пакланяліся духам рэк, азёр, лясоў, асобным жывёлам, а таксама дрэвам, камяням, крыніцам і г.д. Найб. паважаныя язычніцкія багі слав. плямён: *Пярун* (бог грому і маланкі), *Вялес* (бог жывёлагадоўлі), Сварог (бог неба) і яго сын *Дажбог* (бог сонца). Язычніцкія культавыя збудаванні называліся *капішчамі* (*свяцілішчамі*). У цэнтры іх ставіліся драўляныя ці каменныя *ідалы*, каля якіх выконваліся рытуальныя дзеянні.

На Беларусі адметныя рысы язычніцкага светапогляду і магічна-абрадавай практыкі яскрава адлюстроўваліся, напр., у святкаванні *дзядоў*, *радаўніцы*, у звычаях і рытуальных дзеяннях, звязаных з нараджэннем і пахаваннем, ва ўяўленнях пра «той свет», а таксама ў шматлікіх бел. нар. песнях, дзе ўшаноўваюцца сонца, месяц, зоркі, дрэвы, рэкі, згадваюцца такія персанажы нар. дэманалогіі, як русалкі, чэрці, лесавікі, вадзянікі, ваўкалакі і інш. Беларусы на працягу амаль усёй гісторыі даволі актыўна карысталіся спосабамі і сродкамі вербальнай (слоўнай) і невербальнай магіі, што выяўлялася ў шырокім бытаванні разнастайных замоў, праклёнаў, рытуальна-засцерагальных дзеянняў ад усялякіх стыхійных бедстваў, эпідэмій, сац. катаклізмаў (войнаў, генацыду, голаду), звярталіся за дапамогай да ўсялякіх чараўнікоў, вешчуноў, знахараў. Вядомы цэлы комплекс рытуальных дзеянняў пад умоўнай назвай «выкліканне дажджу», звычай ткаць з ахоўнымі мэтамі ахвярнае палатно, т.зв. «абыдзённік». Язычніцкае паходжанне маюць многія стараж. бел. святы, абрады, звычаі — *Купалле*, *Каляды*, трызна, дзяды, радаўніца, *гуканне вясны*, ваджэнне куста, пахаванне «стралы» і інш.

З канца 10—11 ст. Я. на бел. землях пачало паступова выцясняцца хрысціянствам — найперш у выглядзе ўсх. абраду (праваслаўя), некалькі пазней — каталіцтва. Працэс хрысціянізацыі мясц. насельніцтва неаднойчы суправаджаўся ўзаемнымі непрыхільнасцю, сутыкненнямі, праследаваннямі, знішчэннем язычніцкіх свяцілішчаў і ідалаў. Працяглы час на бел. землях захоўвалася «двухвер'е» — адначасова існавалі Я. і хрысціянства. Значная частка мясц. насельніцтва (найперш вяскоўцы) яшчэ доўгі час больш-менш трывала захоўвала старыя язычніцкія вераванні або павярхоўна, вонкава ўспрымала хрысц. веру. У «Аповесці мінулых гадоў» полацкаму князю Усяславу Брачыславічу прыпісваецца нараджэнне ад «валхвавання», а ў «Слове аб паходзе Ігаравым» — здольнасць ператварацца ў ваўка. Паступова хрысц. царква пачала дапасоўваць стараж. язычніцкія вераванні да сваіх царк. свят і абрадаў. Напр., да язычніцкіх Каляд былі дапасаваны святы нараджэння Хрыста (Раство Хрыстова) і *Вадохрышча*; да Купалля — свята Іаана Прадцечы і інш. Функцыі некат. язычніцкіх багоў надаваліся асобным хрысціянскім святым (напр., Вялеса як апекуна жывёлагадоўлі — хрысц. святому Уласу, Ярылы як апекуна земляробства — хрысц. святому Юрыю, Перуна як увасаблення грому і маланкі — хрысц. святому Ілы і да т.п.). Нярэдка на месцы былых язычніцкіх свяцілішчаў будавалі хрысц. храмы (*Полацкі Сафійскі сабор*, Віцебская Благавешчанская царква, *Гродзенская Барысаглебская царква* і інш.).

У сучасным бел. грамадстве для свядомасці часткі насельніцтва характэрны рэлігійныя прымхі, якія маюць у сабе сляды язычніцтва (замовы, варажба, добразычлівыя ці зламоўныя пажаданні і інш.). Да нашага часу асобныя жыхары Беларусі вераць у абрады лячэбнай магіі (знахарства), пакланяюцца асобным камяням, дрэвам, крыніцам і да т.п.

*Літ.*: Б о г д а н о в и ч А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Мн., 1995 [рэпр. выд.: Гродно, 1895]; В о л о ш и н а Т.А., А с т а п о в С.Н. Языческая мифология славян. Ростов н/Д., 1996; Л о з к а А.А. Беларускі народны каляндар. Мн., 2002; Л я ў к о ў Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. Мн., 1992; Н е н а д а в е ц А.М. Святло таямнічага вогнішча. Мн., 1993; Р ы б а к о в Б.А. Язычество древних славян. М., 1981; Я г о ж. Язычество Древней Руси. М., 1987.

*Эдуард Дубянецкі.*

**ЯКАЎ**, полацкі епіскап пач. 14 ст. Вядомы паводле сваёй граматы ў Рыгу 1309. Пасланне Я. прысвечана ўрэгуляванню і юрыд. афармленню гандлёвых адносін паміж Полацкам і Рыгай пасля колькігадовага (верагодна, з 1304) іх пагаршэння. Я. прасіў рыжан прывезці жыта ў Полацк з-за неўраджаю і голаду, якія ахапілі рус. і, магчыма, бел. землі. Грамата Я. сведчыць, што ў пач. 14 ст. Полацк быў феад.-тэакратычнай рэспублікай на чале з епіскапам, якая прызнавала вярх. ўладу вял. князя ВКЛ Віценя (у грамаце Я. называе яго сваім сынам).

*Літ.*: Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв. Вып. 1, 3. М., 1977—80; Д а н и л е в и ч В.Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. Киев, 1896.

*Васіль Варонін.*

**ЯКАЎ ПАЛАЧАНІН**, адзін з герояў *Неўскай бітвы 1240* паміж наўгародцамі і шведамі, лоўчы наўгародскага кн. Аляксандра Яраславіча (Неўскага), ураджэнец Полацка. «Жыціе Аляксандра Неўскага» называе яго 3-м сярод 6 «мужей храбрых и силных», якія вызначыліся ў бітве. Я.П. наехаў на варожы полк з мячом «и мужествовал», за што атрымаў пахвалу князя. У позніх кніжных мініяцюрах са сцэнамі Неўскай бітвы захавалася выява Я.П. З'яўленне Я.П. ў Вял. Ноўгарадзе і яго высокае становішча пры двары князя было звязана, верагодна, са шлюбам Аляксандра Яраславіча з дачкой полацкага кн. *Брачыслава* ў 1239.

*Літ.*: М а н с и к к а В. Житие Александра Невского: Разбор редакций и текст. [СПб.], 1913.

*Васіль Варонін.*

**ЯКАЎЛЕЎ** Мікалай Аляксандравіч (6.4.1924, с. Сідараўская Каднікаўскага пав. Валагодскай губ., цяпер Усць-Кубінскага р-на Валагодскай вобл., Расія — 1.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). На фронце са жн. 1943. Кулямётчык мал. сяржант Я. вызначыўся 28—30.9.1943 каля в. Вялле Брагінскага р-на, калі пасля фарсіравання Дняпра агнём з кулямёта прыкрываў пераправу пяхоты, у баі за в. Галкі адбіў 3 контратакі. Загінуў у баі.

**ЯКАЎЛЕЎ** Усевалад Фёдаравіч (16.4.1895, в. Акроева Волатаўскага р-на Наўгародскай вобл., Расія — 2.4.1974), савецкі военачальнік. Ген.-лейт. (1940). Скончыў школу прапаршчыкаў (1916), курсы

«Выстрал» (1928) і камандзіраў-адзінаначальнікаў пры Ваен.-паліт. акадэміі (1930), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). Удзельнік 1-й сусв. вайны. У Чырв. Арміі з 1918. Са студз. 1938 нам. каманд. войскамі *Беларускай ваеннай акрузе*, каманд. войскамі Забайкальскай, з кастр. 1939 — Калінінскай ваен. акруг. У сав.-фінл. вайну 1939—40 каманд. і нам. каманд. 7-й арміяй. У Вял. Айч. вайну нач. тылу Паўд.-Зах. фронту, нам. нач. Генштаба, каманд. 4-й і 52-й арміямі на Ленінградскім і Волхаўскім франтах. З кастр. 1943 да лют. 1945 каманд. войскамі БВА (у студз.—вер. 1945 — Беларуска-Літоўская ваенная акруга). З 1946 нам., потым каманд. войскамі Стаўрапольскай ваен. акругі. З 1947 у запасе.

*Імануіл Іофе.*

**ЯКАЎЛЕЎ** Фама Паўлавіч [4(17).10.1900, в. Града Віцебскага пав., цяпер Віцебскага р-на — 19.11.1971], генерал-лейтэнант (1944). Скончыў Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна (1933). У Чырв. Арміі з 1920, удзельнік баёў на Паўд. і Туркестанскім франтах. У Вял. Айч. вайну з 1941 чл. ваен. савета Далёкаўсх. фронту, у студз.—сак. 1943 на Волхаўскім фронце. З 1945 нач. палітаддзела Вышэйшай афіцэрскай школы. Да 1947 у Сав. Арміі.

**ЯКАЎЛЕЎ** Якаў Аркадзевіч (сапр. Э п ш т э й н; 21.6.1896, г. Гродна — 29.7.1938), савецкі дзярж. і парт. дзеяч, гісторык, публіцыст. Вучыўся ў Петраградскім політэхн. ін-це. У 1917—20 на парт. рабоце ў Петраградзе, Екацярынаславе, на Украіне. З 1921 на парт. рабоце ў Маскве. З 1926 нам. наркома РСІ. У 1929—34 нарком земляробства СССР, адначасова старшыня Усесаюзнага савета с.-г. калектываў СССР («Калгасцэнтр»), потым заг. с.-г. аддзела ЦК ВКП(б). Актыўна праводзіў палітыку прымусовай калектывізацыі і раскулачвання. Неаднаразова наведваў Беларусь, удзельнічаў у рабоце Ліпеньскага пленума ЦК КП(б)Б 1937 (гл. Дадатак). Чл. ЦВК у 1924—30, ЦК ВКП(б) з 1930. Неабгрунтавана рэпрэсіраваны.

*Тв.*: Об историческом смысле Октября. М., 1922; Деревня, как она есть. 3 изд. М., 1924.

*Літ.*: С и в о л а п о в а Г.Ф. Исследования Я.А.Яковлева по истории Октябрьской революции // История и историки, 1974. М., 1976; К о р н и л о в и ч Э.А. Нарком земледелия // Корнилович Э.А. Люди революционного подвига. Мн., 1985. *Эдуард Карніловіч.*

**ЯКІМАЎ** Міхаіл Пятровіч [15(27).11.1892, г. Дзвінск Віцебскай губ., цяпер г. Даўгаўпілс, Літва — 30.9.1969], генерал-маёр (1942). Скончыў Арэнбургскае ваен. вучылішча (1915), курсы ўдасканалення вышэйшага начсаставу (1927). З 1912 у арміі, з 1919 у Чырв. Арміі, камандзір палка, пам. камандзіра дывізіі, выкладчык ваенна-навуч. установ. У Вял. Айч. вайну з 1943 на Волхаўскім, Сталінградскім, Варонежскім і 1-м Укр. франтах, камандзір дывізіі. Пасля вайны на выкладчыцкай рабоце. Да 1954 у Сав. Арміі.



А.Якімовіч



Г.Якубаў

**ЯКІМО́ВІЧ** Алесь [Аляксандр Іванавіч: 4(17).1.1904, в. Чурылава Ігуменскага пав., цяпер Уздзенскі р-н — 15.1.1979], бел. пісьменнік, адзін з заснавальнікаў бел. дзіцячай л-ры. Засл. дзеяч культуры Беларусі (1968). Скончыў БДУ (1930). Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1924 рэдагаваў час. «Беларускі піянер», «Іскры Ільіча», у 1945—48 — «Бярозку». Працаваў у Дзярж. выд-ве БССР (1948—54), літкансультантам Саюза пісьменнікаў Беларусі (1955—60). Друкаваўся з 1923. Першая кніга — «Вершы» (1925). Пісаў пераважна для дзяцей (зб-кі «Гул бубна», 1925; «Залаты зуб», 1937; «Сябры», 1948; «Залатыя рукі», 1975, і інш.). Значная частка твораў прысвечана гераізму юных барацьбітоў у гады Вял. Айч. вайны, праблемам працоўнага і маральнага выхавання дзяцей, тэме пакутлівага, абяздоленага дзяцінства. У гіст. тэтралогіі — аповесці «Адкуль ліха на свеце» (1963), «Канец сервітуту» (1966), «Кастусь Каліноўскі» (1971, за ўсе Дзярж. прэмія Беларусі 1974), «Цяжкі год» (1975) — паказаў барацьбу бел. народа за сац. і нац. вызваленне. У жанры дакумент. аповесці расказаў пра складаныя падзеі 1863, стварыў запамінальны вобраз К.Каліноўскага. Апрацоўваў бел. нар. казкі, пісаў літаратурныя казкі ў вершах і прозе. Перакладаў на бел. мову.

*Тв.*: Зб. твораў. Т. 1—3. Мн., 1978—80.

**ЯКУ́Б З КАЛІ́НАЎКІ** (К а л і н о ў с к і, К а л і н а ў к а; ? — каля 1583), радыкальны сацыяльны мысліцель-утапіст, ідэолаг левай, плебейска-сялянскай плыні рэфармацыйнага руху на Беларусі. Паходзіў з сял. або дробнашляхецкай сям'і з Падляшша. У 1560-я г. служыў прапаведнікам у антытрынітарскім зборы ў маёнтку магната-кальвініста, канцлера ВКЛ А.*Валовіча.* У 1568 удзельнічаў у антытрынітарскім сінодзе ў г.п. Іўе, дзе разам з *Паўлам з Візны* палемізаваў з кіраўнікім правага крыла антытрынітарызму С.*Будным* па пытаннях свецкай улады і валодання нявольнай чэляддзю, прыгоннымі. У 1569 з групай бел. прыхільнікаў арганізаваў разам з М.*Чаховіцам* у г. Ракаў (Люблінскае ваяводства) прымітыўна-камуніст. суполку, сутнасцю якой была маёмасная і сац. роўнасць, абавязак усіх членаў «зарабляць сабе на хлеб» сваімі рукамі. Услед за *Пятром з Ганёндза* абгрунтаваў ідэю сац. і нац. роўнасці і, спасылаючыся на Біблію, сцвярджаў, што Бог стварыў увесь род чалавечы з адной крыві, таму ўсе людзі браты і ніхто ні над кім не мае права панаваць. «Не можа быць сярод сапраўдных хрысціян розніцы паміж яўрэем і элінам, нявольнікам і вольным, але ж усе павінны быць роўныя... Нельга назваць хрысціянскім грамадства, дзе людзі валодаюць людзьмі, а брат пануе над братам і загадвае яму... Есць толькі адзін пан над усімі намі, гэта Ісус Хрыстос, а ты хочаш, каб было шмат паноў», — звяртаўся ён да Буднага. Крыніцай сац. зла лічыў прыватную ўласнасць, быў прыхільнікам ненасільнага пераўтварэння наяўнай сац. рэчаіснасці праз маральнае самаўдасканаленне чалавека, мірны байкот існуючых грамадскіх і дзярж. устаноў.

*Літ.*: П о д о к ш и н С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (Вторая половина XVI — начало XVII в.). Мн., 1970; B u d n y S. O urzędzie miecza używającem. Warszawa, 1932; Literatura ariańska w Polsce XVI w.: Antologia. Warszawa, 1959.

*Сямён Падокшын.*

**ЯКУ́БАВА**, вёска ў Расонскім р-не, каля якой 18(30) ліп. 1812 адбыўся авангардны бой рус. і франц. войск у час *Клясціцкіх баёў 1812.*

**ЯКУ́БАЎ** Гулям [2(15).5.1915, кішлак Мірзабад Ферганскай вобл., цяпер Андзіжанская вобл., Рэспубліка Узбекістан — 24.6.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Курсы ўдасканалення каманднага саставу (1941). На фронце з ліст. 1942. Рота аўтаматчыкаў на чале з капітанам Я. вызначылася 24.6.1944 пры вызваленні в. Лудчыцы Быхаўскага р-на, дзе ў глыбіні абароны